© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў»

УВАГА! *Фатаграфаванне, капіраванне і распаўсюджванне тэставага матэрыялу цягне за сабой адміністрацыйную адказнасць, прадугледжаную заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.*

Дэманстрацыйны варыянт экзаменацыйнай (тэставай) работы
Беларуская мова

Варыянт змяшчае 40 *заданняў і складаецца з часткі* А *(*18 *заданняў) і часткі* В *(*22 *заданні). На выкананне ўсіх заданняў адводзіцца* 120 *мінут. Заданні рэкамендуецца выконваць па парадку. Калі якое-небудзь з іх выкліча ў Вас цяжкасць, перайдзіце да наступнага. Пасля выканання ўсіх заданняў вярніцеся да прапушчаных. Будзьце ўважлівыя! Жадаем поспеху!*

Частка А

У заданнях часткі А *некалькі правільных адказаў. У бланку адказаў пад нумарам задання пастаўце метку (*х*) у кожнай клетцы, якая адпавядае нумару выбранага Вамі адказу.*

А1. Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць з вялікай літары:
1) Карэліцкі (***Р/р***)***аён***;
2) верш ***«***(***В/в***)***ерасень»***;
3) ордэн (***П/п***)***ашаны***;
4) спелыя (***С/с***)***уніцы***;
5) прэмія (***І/і***)***мя*** Якуба Коласа.

А2. Адзначце словы (прыклады) з правільным напісаннем падкрэсленых літар:
1) а***ў***дыторыя;
2) кніга ***Ў***сяслявы;
3) новая ***у***рна;
4) прыма***ў***ка;
5) па-***у***чарашняму.

А3. Адзначце словы, у якіх няма парушэння арфаграфічных нормаў:
1) прыслоў’е;
2) мышь;
3) восеньскі;
4) мядзьведжы;
5) вераб’іны.

А4. Адзначце словы, якія трэба пісаць праз злучок:
1) (снега) ачыстка;
2) (балкон) лоджыя;
3) (міні) турнір;
4) (паў) Афрыкі;
5) (спец) абутак.

А5. Адзначце словы, якія трэба пісаць разам:
1) (інша) моўны;
2) (паўночна) заходні;
3) (кісла) горкі;
4) (вучэбна) трэніровачны;
5) (аўта) рамонтны.

А6. Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць разам:
1) сказаць (***на***) ***хаду***;
2) (***абы***) ***дзе*** не пабудуеш;
3) (***перш***) ***наперш*** спраектаваць;
4) пакласці (***па***) ***пярок***;
5) (***так***) ***сама*** прыехаў.

А7. Адзначце прыклады, у якіх ***не*** з выдзеленымі словамі трэба пісаць асобна:
1) (***не***) ***адмовіцца*** ад абяцання;
2) (***не***) ***прачытаныя*** мною кнігі;
3) (***не***) ***вялікі*** кабінет;
4) (***не***) ***адчуваючы*** стомы;
5) (***не***) ***як*** наведацца.

А8. Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:
1) падзякаваць сябра;
2) ружовае фламінга;
3) схадзіць па малако;
4) падобная да бабулі;
5) трое вучаніц.

А9. Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:
1) Праца, безумоўна, – аснова жыцця.
2) Расá што дыяменты.
3) Поле араць не рукамі махаць.
4) Белы лебедзь – сімвал вернасці.
5) Лес – рукой падáць.

А10. Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:
1) Шчыгол то трэлі рассыпáў, то акрабатычным спрытам нас здзіўляў.
2) У народнай медыцыне кашаль лячылі кветкамі, або каранямі жоўтага гарлачыка.
3) Усё было мне міла тут: над Нёманам зялёны кут, палі шырокія, узгоркі і смоль сасны, і ў небе зоркі.
4) Многія гарады з кожным годам мяняюць сваё аблічча, але пáмяць стагоддзяў пры гэтым захоўваюць.
5) Малочны, ранішні туман расý збірае з сенажацяў.

А11. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):
1) Беларуса па паходжанні Ліпскага Юрыя Навумавіча мы ведаем__ як вучонага-астранома, які прымаў актыўны ўдзел у даследаванні Месяца.
2) Плывуць па небе__ быццам чаўны__ хмары-вандроўніцы.
3) Беларускія азёры збіраюць у свае глыбокія каўшы зіхатлівыя__ нібы іскрынкі__ начныя зоры.
4) Да шахматнага турніру я падрыхтаваўся__ як след.
5) Зімовы дзянёк__ што свечкі тоненькай агеньчык.

А12. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць знак (знакі) прыпынку:
1) Клапоцячыся пра шчасце іншых__ часта знаходзіш сваё.
2) Пад небам Гародні__ па-весняму гожым__ сам Нёман люструе абрысы Каложы.
3) Прэфікс__ ці інакш прыстаўка__ стаіць перад коранем слова.
4) У сваёй гаспадарцы я сам__ замест сталярá.
5) Каб восенню добры ўраджай атрымаць, нельга вясной__ спусціўшы рукавы__ працаваць.

А13. Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:
1) Сябры пазнаюцца па-мойму як у бядзе, так і ў радасці.
2) Адна і тая ж кніга дарэчы ў розныя перыяды жыцця асэнсоўваецца па-рознаму.
3) Шмат маладых у Маладзечне, вакол Барысава – бары, і слаўна (я там быў!) у Слаўгарадзе вечным, і людзі мірныя ў Міры.
4) Вельмі важна аднак жыць у згодзе з самім сабой.
5) Снег можа пайсці і ў маі.

А14. Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх паміж часткамі трэба паставіць знак прыпынку:
1) Якая ціхая ноч і колькі ў небе зорак-агняцветаў!
2) Хвіліна-другая і небакрай запалае.
3) Зноў трапечуць чырванаватым лісцем маладыя асінкі і хваляцца ярка-чырвонымі гронкамі стройныя рабінкі.
4) Сваю вольную песню пяе Белавежа і, нібы карабель, над Дзвіною Сафія плыве.
5) Світае і распагоджваецца.

А15. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць знак прыпынку:
1) Вёска – гэта дзяжа__ ў якой крута замешана цеста з працавітасці, памяркоўнасці, добразычлівасці і гасціннасці.
2) Чуецца ў песні народнай, як звіняць крыніцы__ і як шумяць спрадвечныя бары.
3) Кузьма Чорны пазбягаў у сваіх творах дзеепрыслоўных і дзеепрыметнікавых зваротаў__ бо лічыў, што яны не ўласцівыя беларускай мове.
4) У народзе кажуць, што__ калі добры госць падыходзіць да дзвярэй, то дзверы самі расчыняюцца.
5) Каб сабраць адзін кілаграм нектару__ пчале трэба абляцець да пяцідзесяці тысяч кветак.

А16. Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць двукроп'е:
1) Заўважыў правільна народ__ мудрэйшая за вечар раніца.
2) Мухамор з'яўляецца выдатным доктарам і лясным санітарам__ ён лечыць звяроў і аздараўляе глебу.
3) Няхай заўжды будзе з мёдам ліпень__ няхай заўжды з пшаніцай будзе жнівень.
4) Падзьмуў вецер__ апусціўся на дол апошні кляновы лісток.
5) Надыдзе восень__ спраў будзе восем.

А17. Адзначце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць знак прыпынку:
1) У верасні сонца яшчэ грэе__ і дыхае цяплом зямля, але ў рацэ, што ўлетку вабіла, пахаладзела ўжо вада.
2) Калі размаўляюць вочы__ заўсёды нямеюць словы, і часам усяго адзін позірк каштуе цэлай паэмы.
3) Ёсць жаданне – час знаходзіцца, а__ калі жадання няма, то знаходзіцца прычына.
4) Люблю ў прыродзе светлую часіну: квітнее сад, духмяніць лугавіна, спявае звонка лес__ і водарам чаруе бэз.
5) Гудуць над кветкамі пчолы, стракочуць у лузе конікі, ляшчыннік арэхі гушкае__ і звініць ручаёк тоненькі.

А18. Адзначце сцверджанні, якія адпавядаюць сказу з простай мовай:

«Зямлю на тканых і вышываных вырабах – пачаў размову з вучнямі кіраўнік гуртка, нашы продкі адлюстроўвалі ў выглядзе прамавугольніка».

1) у сказе адсутнічае коска;
2) у сказе адсутнічае кропка;
3) у сказе адсутнічае працяжнік;
4) простая мова няправільна заключана ў двукоссе;
5) у сказе адсутнічае двукроп'е.

Частка В

Адказы, атрыманыя пры выкананні заданняў часткі В*, запішыце ў бланку адказаў. Кожную літару, лічбу пішыце ў асобнай клетцы (пачынаючы з першай) па ўзорах, указаных у бланку.*

Літару ***ё*** *пішыце наступным чынам:* Ё.

В1. З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:

драўляны, глытаць, сальфеджыо, почырк, водаканал.

В2. З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:

зернясховішча, пейзаж, мяккаваты, цяплыня, бясконцы.

В3. З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:

пераносчык, казьба, карысны, цяжкі, міласэрны.

В4. З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:

разводдзе, пасажыр, журавіннік, насенне, раздолье.

В5. Запішыце лічэбнік ***дзевяцьсот*** у форме творнага склону.

В6. Ад асновы дзеяслова ***вымыць*** утварыце поўны дзеепрыметнік залежнага стану прошлага часу і запішыце яго ў форме назоўнага склону множнага ліку.

В7. З прапанаваных слоў вызначце тое, якое мае лексічнае значэнне ‘*агароджа, пераважна з жэрдак*’, і запішыце гэта слова:

плод, плот, плыт, падлога, кладка.

В8. З прапанаваных сказаў выберыце аднасастаўны сказ і запішыце яго граматычную аснову:

Падышоў да броду зубр доўгабароды.
Рысь – спрытная, дужая і хітрая жывёліна.
Абеліск «Мінск – горад-герой» адкрылі ў 1985 годзе.
Чытаць – мой любімы занятак.
Два і два – чатыры.

В9. Вызначце спосаб утварэння прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

А. Выбар.	**1.** Прыставачна-суфіксальны.
Б. Добра.	**2.** Бяссуфіксны (нульсуфіксальны).
В. Зрэдку.	**3.** Суфіксальны.
Г. Звышмоцны.	**4.** Словаскладанне.
	5. Прыставачны.

В10. Вызначце марфемную будову прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

А. Агароджа.	**1.** Слова, якое мае нулявы канчатак.
Б. Правільна.	**2.** Слова, якое мае ***1*** суфікс.
В. Паралельны.	**3.** Слова, якое мае прыстаўку.
Г. Унук.	**4.** Складанае слова.
	5. Слова, якое мае ***2*** суфіксы.

В11. Узнавіце фразеалагізмы, прапанаваныя ў левым слупку табліцы, уставіўшы на месцы пропускаў лічэбнікі з правага слупка. Устанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

А. Як свае **…** пальцаў.	**1.** адзін
Б. За **…** прысест.	**2.** два
В. На ўсе **…** бакі́.	**3.** тры
Г. Як двойчы **…** .	**4.** чатыры
	5. пяць

Тэкст да заданняў В12–В22

(1) *Глыбоччына! Чароўны азёрны край!* (2) *Ты з радасцю сустракаеш усіх, хто жадае сэрцам дакрануцца да* ***тваіх*** *казачных краявідаў.*

(3) *Цяжка сказаць, якое са ста шасці азёр Глыбоччыны, вялікіх і малых, самае прыгожае.* (4) *Усе яны прыцягваюць* ***увагу****, выклікаюць захапленне ў кожнага вандроўніка, якому пашчасціла хоць раз ступіць на іх квяціста-духмяныя берагі.*

(5) *(Буйны) возера, што вабіць не толькі глыбачан, але і шматлікіх турыстаў, носіць незвычайную назву – Шо.* (6) *На паўднёвым беразе гэтага возера ёсць месца, якое тутэйшыя рыбакі называюць Крыжы.* (7) *Калі ў гэтым месцы добра ўгледзецца ў ваду, то на дне можна ўбачыць вялікія валуны розных крыжападобных канфігурацый.* (8) *Старажылы ўзгадвалі, быццам некалі тут былі могілкі, але Шо схавала іх пад сваю вадзяную роўнядзь.*

(9) *А вось возера Гінькава адметнае тым, што на яго стромкім беразе ёсць адзіная ў Беларусі карставая пячора.* (10) *Яшчэ пра возера ходзіць цікавая легенда, што ў яго глыбіні схаваны скарбы, нарабаваныя напалеонаўскім войскам.*

(11) *Шмат легенд і (не, ні) адно паданне складзена пра трэцяе возера – Івесь.* (12) *Узгорак на яго беразе* ***завуць*** *Царкавішчам.* (13) *Так, напрыклад, існуе легенда, у якой апавядаецца пра храм, што праваліўся пад зямлю.* (14) *На Вялікдзень, кажуць людзі, і сёння можна пачуць звон і царкоўныя спевы, калі прыкласці вуха да святочнай зямлі.* (15) *А перад замаразкамі на гэты ўзгорак кожны год чамусьці злятаюцца лебедзі.* (16) *Што так прыцягвае* ***птушак*** *менавіта сюды,* ***арнітолагі*** *дакладна не высветлілі.* (17) *Але, безумоўна, наведванне чароўнымі птушкамі гэтай мясціны робіць яе яшчэ больш загадкавай.*

В12. Вызначце правільнае сцверджанне ў дачыненні да тэксту. Адказ запішыце лічбай. Напрыклад: 1:
1) тэкст афіцыйнага стылю;
2) тэкст навуковага стылю;
3) тэкст гутарковага стылю;
4) тэкст публіцыстычнага стылю;
5) тэкст мастацкага стылю.

В13. З двух слоў, выдзеленых у ***16-м*** сказе тэксту, вызначце тое, якое з'яўляецца сродкам сувязі ***15-га*** і ***16-га*** сказаў. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***16-м*** сказе.

В14. Знайдзіце ў ***7-м*** сказе тэксту немэтазгодна (збыткоўна) выкарыстанае слова, якое парушае правільнасць маўлення. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***7-м*** сказе.

В15. Знайдзіце ў ***3-м*** сказе тэксту слова, у якім адбываецца аглушэнне. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***3-м*** сказе.

В16. Запішыце выдзелены ў ***4-м*** сказе тэксту назоўнік у форме давальнага склону адзіночнага ліку.

В17. Запішыце прыметнік, прапанаваны ў дужках у ***5-м*** сказе тэксту, у простай форме найвышэйшай ступені параўнання, назоўным склоне, адзіночным ліку, ніякім родзе.

В18. Запішыце выдзелены ў ***2-м*** сказе тэксту займеннік у форме роднага склону адзіночнага ліку.

В19. Запішыце выдзелены ў ***12-м*** сказе тэксту дзеяслоў у форме абвеснага ладу цяперашняга часу 2-й асобы множнага ліку.

В20. З дзвюх часціц, прапанаваных у дужках у ***11-м*** сказе тэксту, вызначце тую, якая павінна быць ужыта ў дадзеным сказе. Запішыце гэту часціцу.

В21. Знайдзіце ў ***15-м*** сказе тэксту вытворны прыназоўнік і запішыце яго.

В22. Вызначце ў ***9-м*** сказе тэксту слова, якое з'яўляецца адзіночным прыдаткам. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***9-м*** сказе.